✓**23 студзеня** ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылося **адкрыццё выстаўкі «Вяртанне»**, прысвечанай спадчыне графаў Храптовічаў – сядзібе ў Шчорсах (Карэліцкі раён). У 1770-х гг. па загадзе Іаахіма Храптовіча над палацавым ансамблем з вялікім паркам і сажалкамі працавалі Джузэпэ дэ Сака, Карла Спампані і Якуб Габрыэль. У XIX ст. маёнтак Храптовічаў быў важным культурным цэнтрам з вядомай калекцыяй прадметаў мастацтва і знакамітай бібліятэкай. Сюды прыязджалі Адам Міцкевіч, Уладзіслаў Сыракомля, а бібліятэкарам некаторы час працаваў Ян Чачот. Да нашых дзён захаваліся некалькі пабудоваў і рэшткі парку. Сядзіба ўключаная ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь. На выстаўцы прадстаўленыя жывапісныя працы, эцюды, акварэльныя замалёўкі – вынікі трох пленэраў, што прайшлі ў сядзібе «Шчорсы». Мастакі імкнуліся ўзнавіць аблічча ансамбля, яго ваколіцаў і пабудоваў у такім выглядзе, быццам бы іх не закрануў час. Дэманструецца таксама карціна Іагана Томаса ван Кесера «Бяленне палатна пад Харлемам» (1675), што ўпрыгожвала палац да 1914 г. На сёння ў Дзяржаўным музеі выяўленчых мастацтваў імя А.С. Пушкіна ў Маскве захоўваюцца 8 працаў з калецыі Храптовічаў.

У адкрыцці бралі ўдзел краязнаўца і калекцыянер Дзмітрый Шаўня, мастак-жывапісец, член Беларускага саюза мастакоў, прафесар Аляксандр Ксяндзоў, навуковы супрацоўнік Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, кандыдат мастацтвазнаўства, Галіна Флікоп-Світа.



Фота Наталі КУПРЭВІЧ

Дзмітрый Шаўня і аўтар плана Шчорсаў Рубен Атаян